
ЗАПІСЫ

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ НАВУКІ Й МАСТАЦТВА

BELARUSIAN INSTITUTE OF ARTS AND SCIENCES

ZAPISY 20

БІБЛЯТЭКА



10002802

Віленскага
Беларускага Музэю
імя І. Луцкевіча

NEW YORK 1992

Шмат перадумаў усяго, седзячы ў будцы. Калі-ж сьцямнела, зьлез з дуба і пасьпяшыў на грэблю, што вяла праз паплавы ў вёску.

Ня буду апавядаць пра спатканьне з матуляй, сёстрамі. Былі радасьці сьлёзы, а пасьля разьвітаньне ...

Схадзіў у Грэзак, каб праПісацца, а там, у міліцыі, сказалі, каб за дваццаць чатыры гадзіны «пакінуў пагранічную зону» ...

«А мой-жа ты сыночак даражэнькі,
А куды-ж панясуць цябе ізноў ножанькі?
Ці-ж ты мала стаптаў тых дарожак?..
А Божачка, мой Божа! ..»

І яшчэ ня раз галасіла Майсейчыкава Мар'яна ...

1990 г.

Язэп Лешчанка.

ЗАЦЕМКІ
NOTES

Яшчэ раз пра Антона Луцкевіча

Александра Бэргман

У 1974 годзе ў «Пшэглёндзе Гісторычным» быў зьмешчаны мой нарыс пра Луцкевіча, а яшчэ крыху раней, у 1972 г., ягоная біяграфія. Для некаторых гэта было нечаканасьцю, бо ў 60-ыя гады я была больш зацікаўлена Грамадой і КПЗБ. Пра Луцкевіча я ведала вельмі мала, аднак чытала ў шматлікіх артыкулах і кніжках, што ён — «найбольшы вораг і КПЗБ і Грамады.»

Луцкевіч мяне цікавіў. Але ў тагачасных абставінах сама не магла-б узяцца за такую тэму. А сталася гэта проста гэтак: у 1970 ці 1971 г. я нечакана атрымала ліст ад Польскага біяграфічнага слоўніка (ПСБ), у якім была прапанова апрацаваць біяграфію трох асобаў, у тым ліку і Луцкевіча. Гэты ліст зрабіў на мяне вялікае ўражаньне, і няручна было адмовіцца. Я згадзілася пісаць пра Луцкевіча і неадкладна пачала зьбіраць матар'ялы.

Супраць гэтага былі асабліва даўныя дзеячы з кіраўніцтва КПЗБ ня гледзячы на тое, што яшчэ ў 1962 г. я пісала пра Луцкевіча, што ён разам з Р. Астроўскім «адыграў ганебную ролю, калі пасьля дэлегалізацыі Грамады блякаваўся адкрыта з санацыяй (гэта значыць выступаючы ў адным блёку). (1) Выкарыстанае сфармуляваньне найлепш

паказвае тагачасны стыль пісаньня. У канцы я сабрала шмат больш матар'ялаў, чымсьці было неабходна да біяграфіі ПСБ. (2)

Пазьней, калі я даведалася больш пра Луцкевіча, мае адносіны да ягонае асобы значна зьмяніліся. Упяршыню я чытала такую масу ягонае публіцыстыкі й гісторыі беларускай літаратуры. Асабліва ўражаньне зрабілі на мяне ягоныя артыкулы ў «Нашай Ніве» і яе календарох, ягоны спосаб пісаньня. Вялікае ўражаньне зрабілі таксама ягоныя працы ў Беларускім музэі ў 30-ыя гады і ўдзел у Беларускім Навуковым Таварыстве ад пачатку да канца яго існаваньня (1918-1939). Штораз дакладней я бачыла ў ім чалавека, які ў вялікай меры тварыў гісторыю культуры беларускага народу. Вось на гэтым фактычна й абапіралася ягоная роля ў гісторыі. (3)

Але як аб гэтым пісаць?

Гэта аказалася найважнейшым пытаньнем.

Тагачасная польская цэнзура «ня любіла», каб пісалі аб тым, што нявыгадна Савецкаму Саюзу. А ў БССР Луцкевіча лічылі ворагам да такое ступені, што яго прозьвішча нельга было ўспамінаць ні ў прэсе, ні ў кніжках. Калі ў 1956 г. зрэгабілітавалі бальшыню беларускіх дзеячоў, арыштаваных у 1930-1953 гг., сярод іх ня было Луцкевіча. (4)

Апрача таго, адзіным часапісам, які ў 70-ыя гады прыймаў мае працы на беларускія тэмы, быў «Пшэглёнд Гісторычны». Аднак-жа галоўны рэдактар два разы казаў мне, што ў яго «пыталіся,» чаму ён так цікавіцца беларускімі справамі?

Былі й іншыя цяжкасьці. У Польшчы не хапала многіх беларускіх газэтаў, якія Луцкевіч выдаваў пазьней за «Нашу Ніву» (ад 1915 да 1922 г.). Я вельмі слаба ведала гэты пэрыяд яго жыцьця, які прыпадаў на 1917-1922 гады.

Праўда, памаглі мне ягоныя сваякі, аб якіх я да гэтае пары нічога ня ведала, як і яны аба мне. Ня гледзячы на ўсе цяжкасьці, біяграфічны нарыс пра Луцкевіча ўсё-ж такі выйшаў, абыймаючы ў асноўным цэлае ягонае жыцьцё. Зь Нью Ёрку я атрымала зусім неблагія рэцэнзіі. Даходзілі да мяне таксама весткі, што на Беларусі нарыс трактаваўся як рэгабілітацыя Луцкевіча. (5)

Калі цяпер я яшчэ раз прагледзела мой нарыс пра Луцкевіча, дык выразна зразумела, што далёка ня ўсё было ў ім высьветлена належным чынам. Зашмат месца я тады прысьвяціла праблеме, якую можна было акрэсьліць як: «КПЗБ і Луцкевіч». Ці вось дзеля гэтага зьбіраюся пісаць новую ад пачатку да канца біяграфію? Не, гэтым хай займаецца маладое пакаленьне. (6) Я хачу дадаць толькі некалькі фактаў зь яго жыцьця, аб якіх я даведалася пазьней (пасьля выданьня нарысу), а якія, па-мойму, важныя дзеля пазнаньня яго асобы.

Перш-наперш хачу сказаць аб тым скандальным выступленьні Луцкевіча на працэсе Грамады ў 1928 г. у Вільні, у якім ён сказаў: «Ні арганізацыйна, ні ідэялягічна я з грамадаўскім рухам нічога супольнага ня меў.» За гэта я яго крытыкавала можа й зашмат, бо абвінавачвала яго ў тым, што «ня мог зразумець, якое значэньне для ўсяго беларускага народу мела зьнішчэньне Грамады». Ня гледзячы на тое, што ў яго асьведчаньні ўсё фармальна згаджалася, я ўжо тады ведала, што ён захаваўся гэтак толькі таму, што хацеў «за ўсялякую цану» выйсьці з турмы. А як сёньня ацэньваю яго сапраўдныя адносіны да Грамады?

Нядаўна я чытала дакумант пра інтэрв'ю, дадзенае Луцкевічам супрацоўніку віленскай гэбрэйскай газэты «Цайт» на тэму Грамады 25 студзеня 1927 г., гэта значыць два тыдні пасьля арышту яе паслоў. (7)

Вось што пісаў «Цайт» пра Луцкевіча: «Ведамы беларускі дзеяч і былы прэм'ер першага беларускага ўраду А. Луцкевіч між іншага сказаў: 'За апошні час назіраецца вялікае эканамічнае і палітычнае ажыўленьне сярод беларусаў. З палітычных арганізацыяў найважнейшай зьяўляецца Грамада, якая налічвае 90,000 сяброў і 1800 гуртоў. У Сойме кірунак гэты прадстаўляюць паслы: Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Валошын, Мятла і Сабалеўскі. Меншую ролю адыгрываюць Сялянскі Саюз і Хрысьціянская Дэмакратыя.' » Далей чытаем: «Гаворачы аб закідах, што Грамада працавала за чужыя грошы, Луцкевіч сьцьвярджае, што Грамада мае так шмат сяброў, што не патрабуе заграничнай дапамогі.» На пытаньне «Які яго пагляд на апошнія арышты?», Луцкевіч адказаў, што «падставы да іх былі вельмі слабыя. Арышты беларускіх дзеячоў ёсьць *пачаткам уціску беларускага народнага руху* (падкр. -*А.Б.*). Адносіны беларускіх арганізацыяў да гэтых арыштаў нэгатыўныя і штодзённа адбываюцца пратэстацыйныя сходы» і што ён асабіста зьвяртаўся ў гэтай справе да пракуратуры.

Адным словам выразная розьніца з тым, што ён сам гаварыў на працэсе. Гэтае інтэрв'ю карэспандэнта газэты «Цайт» з Луцкевічам, прывяло мне на памяць адну важную дэталь зьвязаную з 1927 годам. Зусім нядаўна я дайшла да высновы, што беларускімі справамі ў 1927 г. (пасьля арышту кіраўніцтва КПЗБ і Грамады) кіравалі дзьве асобы: Луцкевіч і Дварчанін. (Прыпамінаю, што Луцкевіч быў арыштаваны 10 месяцаў пазьней за ўсё кіраўніцтва Грамады).

Гэта быў якраз час выбараў у гмінныя самаўрады, у якіх грамадаўцы здабылі значныя ўплывы.(8) Тое, што Луцкевіч прыймаў актыўны ўдзел у выбарах 1927 г., відаць з актаў сьледзтва ў працэсе Грамады.

з гэтага штораз ясьней вынікае, што працэс ня высьветліў поўнае праўды, тым больш што Луцкевіч не перастаў супрацоўнічаць з грамадаўскімі газэтамі. (9)

Але ведама таксама, што ўступаць у сябры Грамады Луцкевіч не хацеў: сварыўся з кіраўніцтвам Грамады ад 1925 году. Усё паказвае на тое, што ён быў супраць падзелу Беларускага Соймавага Клюбу. Ён быў кіраўніком Беларускага Выбарчага Цэнтральнага Камітэту (у 1922 г.) і для арганізацыі гэтага клюбу прысьвяціў шмат; фактычна адыграў у ім найважнейшую ролю. Ён усьведамляў сабе важнасьць гэтай *першай у гісторыі беларусаў інстытуцыі*, якой быў Польскі Сойм. Таму падзел клюбу ўважаў за вялікую памылку. І хаця на гэту тэму я нічога ня чытала, але ведама гэта з выказваньняў а. Адама Станкевіча і Ул. Самойлы, зь якімі Луцкевіч блізка супрацоўнічаў таксама ў 30-ыя гады, фактычна аж да сьмерці. Кс. А. Станкевіч адкрыта гаварыў, што падзел клюбу ня быў карысны для беларускага сялянства. Як выявілася потым, на падзеле гэтым залежала Камуністычнай Фракцыі Сойму. А ў арганізаваньні Грамады, як масавай арганізацыі, прыймалі ўдзел усе сябры Беларускага Клюбу, г. зн. і тыя, што не хацелі супрацоўнічаць з Камуністычнай Соймавай Фракцыяй. (10) Непрыпадкова былыя грамадаўцы, зь якімі я гутарыла ў 70-ыя гады, гаварылі: камуністы прыйшлі ў Грамаду «на гатовенькае».

Сьведчаць аб гэтым таксама матар'ялы з III-й канфэрэнцыі КПЗБ, на якой кіраўніцтва загадала свайму актыву прыймаць удзел у працы Грамады. III-я канфэрэнцыя КПЗБ адбылася ў студзені 1926 г., камуністы ўключыліся ў гэты рух ад паловы 1926 г., а Грамада паўстала ў чэрвені 1925 году. (11)

Луцкевіч спрачаўся з грамадаўцамі (асабліва з Тарашкевічам) яшчэ з тае прычыны, што ён лепш за ўсіх беларускіх дзеячоў ведаў, якой палітыкі можа Беларусь чакаць з боку Масквы. Асабіста быў ён зьвязаны зь некаторымі выдатнымі дзеячамі БССР, якія лічылі яго «шэрай эмінэнцыяй» і вельмі высока цанілі, прысылалі да яго спэцыяльных эмісараў.

Між іншым, нельга выключыць і таго, што ягоная адмова кандыдаваць у Сойм была ў пэўнай меры вынікам яго размоваў зь сябрамі з БССР. (12)

Ужо ў 1926 г. Луцкевіч ведаў, што беларускую інтэлігенцыю чакаюць два галоўныя абвінавачаньні. Па-першае, наступяць рэпрэсіі за «нацыяналізм», па-другое, з прычыны ўмацаваньня дыктатуры й цэнтралізму, распачнецца змаганьне з дэмакратыяй. Між іншым, якраз адтуль у адносінах да беларускай інтэлігенцыі бяруцца закіды пад назовам «нацыянал-дэмакратызму.» Апрача гэтага, Луцкевіч

шмат раней за іншых ведаў аб пачатку калектывізацыі, гутаркі аб якой фармальна пачаліся толькі ў 1927 годзе.

Усё гэта не давала надзеі, што стараньні Грамады аб атрыманьні дапамогі ад БССР прынясуць нейкія вынікі.

Паўстае пытаньне: няўжо лідары Грамады ў 1926 г. ня ведалі аб зьменах, якія адбываюцца ў БССР? Гэта здаецца немагчымым, хаця маглі даведацца аб гэтым пазьней за Луцкевіча. А што найважнейшае — яны дзейнічалі ў нязвычайным руху, пацягнулі іх за сабой масы.

Апрача гэтага, Тарашкевіч, найважнейшая асоба Грамады, быў іншай як Луцкевіч думкі у адным з самых істотных пытаньняў. Тарашкевіч цьвердзіў, што палякі са сваёй культурай і традыцыяй хутка асымілююць беларусаў, а з Масквой яны (г.зн. беларусы) і самі справяцца. І моцна тут памыліўся. (13)

Варта тут успомніць таксама пра ліст, які я нядаўна атрымала ад старэйшага сына Луцкевіча — Юрыя. Ён, між іншым, піша аб размове яго бацькі з Тарашкевічам. Дакладна ня ведае, у каторым годзе размова адбылася. Але ён аб гэтым чуў, а нават бачыў яе запіс у аднэй з бацькавых папак 50 гадоў таму. Варта аб гэтым прыпомніць. Паводля Юрыя яна мела такі зьмест: Тарашкевіч быў думкі, што ў кароткім часе на сьвеце павінна выбухнуць «рэвалюцыйнае паўстаньне», і што варта да яго прылучыцца. На гэта Луцкевіч, праўдападобна, адказаў гэтак: «Сусьветная рэвалюцыя калі й выбухне, то ня так хутка, а калі вы прыедзеце за 10 гадоў, дык маёй заслугай будзе, што прыедзеце ў Заходнюю Беларусь, а не ва Ўсходнюю Польшчу. А мяне можаце арыштаваць і расстраляць.»

Гэты ліст я атрымала 9. III. 1990 г. У ім відаць ня толькі розьніцу пагляд аў Тарашкевіча й Луцкевіча, але паўстае таксама дзіўнае пытаньне: чаму Луцкевіч у 1939 г. не ўцякаў зь Вільні? Тым больш што на гэта ўгаворвалі яго іншыя, ды ён і сам ведаў, што чакае яго з боку саветаў.

Ад некалькіх віленскіх сем'яў я даведалася, што спачатку кіраўніцтва Чырвонай Арміі абяцала Самойлу, Уласаву і некалькім іншым, што яны змогуць займацца беларускай дзейнасьцю, якая будзе ім адпавядаць. Магчыма, што ў выніку гэтых абяцанак яны й не ўцякалі зь Вільні. Але здаецца, што была яшчэ адна, важнейшая прычына, а менавіта — зьяднаньне Беларусі, пра якое Луцкевіч гэтак доўга марыў, а пра ўсё іншае забыўся.

На заканчэньне застаецца яшчэ некалькі справаў. Напрыклад, справа сьмерці Луцкевіча, яе месца й часу.

Калі я пісала гістарычны нарыс пра яго, ягоныя сваякі із ЗША прыслалі мне ліст (бяз подпісу), напісаны нібы яго сястрой Эміліяй,

якая ў той момант ужо ня жыла. З гэтага ліста я даведалася, што Луцкевіч пасьля арышту ў Вільні быў праз даўжэйшы час у турме ў Вялейцы. Там яго й шмат іншых трымалі аж да пачатку вайны зь Нямеччынай. І толькі тады, у 1941 г. усіх іх пагналі на ўсход, расстрэльваючы па дарозе слабейшых. Сярод іх быў, здаецца і Луцкевіч. Шмат гадоў пазьней я даведалася, што якраз так скончылася жыцьцё Самойлы, Рэйзэна й іншых. Але сыны Луцкевіча, якія жылі ў Савецкім Саюзе (і самыя мелі дзеці) далі мне іншую інфармацыю. Я выкарыстала яе ня толькі таму, што на ліст із ЗША было-б у тыя часы цяжэй паклікацца. Я ведала, што не адзін (нават зь пісьменьнікаў) таіўся з тым, што яго бацькі былі рэпрэсіяваныя. Якраз гэтым фактам я галоўным чынам кіравалася. (14)

Антон Луцкевіч быў зрэгабілітаваны Пракуратурай Летувіскай ССР 31 сакавіка 1989 году. З дакумэнтаў Пракуратуры відаць, што Антон Луцкевіч, сын Івана, быў арыштаваны 30. IX. 1939 г. і праз «Особое Совещание» пры НКВД БССР быў засуджаны на 6 год лягеру. Зрэгабілітавалі яго на падставе Пастановы Прэзыдыюму Найвышэйшай Рады БССР ад дня 16. I. 1989 г. « Аб дадатковых правілах вяртаньня справядлівасьці ў дачыненьні да ахвяраў рэпрэсіяў, якія мелі месца ў 30-40-ых і на пачатку 50-ых гадоў.» (15)

Заканчэньне. Наколькі мне ведама, арыштаваных НКВД, а асабліва людзей такіх, як Луцкевіч, прымушалі пісаць аўтабіяграфіі. У былым Цэнтральным Архіве ЦК ПАРП (PZPR) такія дакуманты (ня ўсім даступныя) знаходзіліся. Трэба старацца здабыць аўтабіяграфію Луцкевіча з актаў НКВД.

КАМЭНТАРЫ

(1) "Białoruska Włościansko-Robotnicza Hromada,— " Z Pola Walki", 1962. Nr. 3, st. 92.

(2) Сабраныя матар'ялы былі асновай наступных артыкулаў: у 1972 г. — «Беларускі тыднёвік Наша Ніва» — "Kwartalnik Historyczny", tom III, st. 563-582 ; у 1973 г. — Біяграфія А. Луцкевіча ў ПСБ, том XУIII/4 (сшытак 78), ст. 514-515 ; «Антон Луцкевіч - біяграфічны нарыс у "Przegląd Historyczny", сшытак 4, ст. 667-695. На старонках артыкулу Януша Гарневіча ў сшытку гадавіка "Acta Baltico-Slavica" — рэцэнзія ў "Studia dziejów ZSSR i Europy Środkowej" — том XXIII, ст. 437-442 ; «Антон Луцкевіч» (на 100-ыя ўгодкі народжаньня), — «Ніва», Беласток, 29. I. 1984. Там-жа — іншыя.

(3) У 80-ых гадох малодшы сын Луцкевіча, Лявон, падрыхтаваў «Бібліяграфію працаў Антона Луцкевіча», якая ад 1987 г. знаходзіцца ў Бібліятэцы Варшаўскага Ўнівэрсытэту у аддзеле

рукапісаў, — сыгн. 32-75.

(4) Мне ведама, што некаторыя палякі (прыкладам, Е. Путрамэнт) ня былі здаволеныя з выхаду ў сьвет майго нарысу пра А. Луцкевіча. Тое самае адчувалася і ў Беларусі.

(5) А. Багровіч , «Александра Бэргман: Антон Луцкевіч, біяграфічны нарыс», "Przegląd Historyczny", Варшава, сшытак 4, 1974 г. — «Запісы», № 13, ст. 119-124. Паказваючы на цэлы рад памылак аўтара, Багровіч аднак у цэласьці ацаніў «аб'ектыўнасьць, рэдка спатыканую ў камуністычных публікацыях».

(6) Гэта ўжо пачалося: у 1989 г. беларуская студэнтка Аўгенія Шымчук апрацавала магістэрскую працу на тэму «Беларуская праблема ў міжнародных адносінах у 1915-1921 гг.», г. зн. дакладна той пэрыяд, якога не хапала ў маім нарысе і ў якім Луцкевіч адыграў вельмі важную ролю.

(7) Тэкст інтэрв'ю Луцкевіча аб беларускіх справах, дадзенага гэбрэйскай газэце «Цайт» пад загалоўкам «Варшаўская Прэсавая Інфармацыя, Варшава, вул. Вільча 32/3, тэл. 24651», перанесены ў Архіў Новых Актаў, аддзел VI.

(8) A. Bergman. "Białoruska Włościansko-Robotnicza Hromada" — Sprawy bialoruskie w II Rzeczypospolitej, ст. 127.

(9) Таго-ж аўтара - «Аб Бр. Тарашкевічу», ст. 144, кам. 21. Сэнатар Васіль Рагуля цьвердзіў, што ў часе існаваньня Грамады галоўным рэдактарам грамадаўскіх газэт заставаўся Луцкевіч. Васіль Рагуля, «Успаміны», Нью Ёрк, 1957 г., ст. 61.

(10) "Sprawy Białoruskie", ст. 124, камэнтар 98.

(11) Справаздача Корчыка й Лагіновіча на III-яй канфэрэнцыі КПЗБ у 1926 г. у был. САКС PZPR, аддзел КПЗБ.

(12) Паводля некаторых дадзеных ведама, што да Луцкевіча прыяжджалі людзі зь іншых краінаў, а таксама зь Менску, — між іншых нейкі Ільючонак. Пар. "Zarys Ruchu Białoruskiego" у былым Цэнтр. Архіве ЦК ПАПР, м/ф. 730, разьдз. 25, а таксама ліст старэйшага сына Юрыя ад 8. II. 1990 г. (у прыватных руках).

(13) Успаміны пасла ў сойм (1922-1928) Вацлава Бітнэра, б. школьнага сябры Б. Тарашкевіча, гл. асабістую папку Тарашкевіча у б. ЦА ПАПР, № 5941.

(14) Апісаньне канца жыцьця Луцкевіча ў нарысе было проста памылкай, і нажаль, не адзінай. З гэтага відаць, што заўсёды трэба лічыцца зь сям'ёй. І дзеля гэтага я тутака хачу дадаць яшчэ адну справу, аб якой я дагэтуль маўчала. Бо, гаворачы, як Луцкевіч

паводзіў сябе на працэсе, я брала пад увагу толькі палітычныя справы. А вось ня можна выключаць, што вялікую ролю адыгралі й асабістыя. Пасьля выхаду з турмы ў 1929 годзе Луцкевіч перажыў сямейную трагедыю: шмат маладзейшая і быццам вельмі прыгожая яго жонка учыніла самагубства. Найбольш праўдападобна, што Луцкевіч бачыў-бы іншую разьвязку гэтае справы, калі-б ён быў на волі.

(15) Копія дакуманту, cькіраванага да Інстытуту Літаратуры АН БССР, далучана да «Бібліяграфіі працаў Луцкевіча», падрыхтаванай тым-жа Інстытутам у 1989 г. (у прыватных руках).

Notes on Belarusian-American-English Literary Relations

Vitaut Kipel
Belarusian Institute of Arts and Sciences

The interrelationships among American, English, and Belarusian literatures, the theme of Belarusica in English-language belles-lettres, and that of America in modern Belarusian literature are virtually unexplored despite the plethora of materials available for analysis. The notes that follow are intended to signal these topics as areas awaiting their researcher.

Belarusica in American Literature

Notions about the poetic aspects of Belarusian folklore appeared in America at the beginning of the 19th century. (1)

A major twentieth-century literary figure who took notice of Belarusian immigrants in this country was Upton Sinclair. In his classic *The Jungle* (1906), which inter alia, depicts the life of a Lithuanian immigrant, the author says (p. 263): "One night he was caught by a thunderstorm, and he sought shelter in a little house just outside of a town. It was a working man's home, and the owner was a Slav like himself, a new emigrant from White Russia. He bade Jurgis welcome in his home language, and told him to come to the kitchen fire and dry himself." (2)

Most descriptions of Belarusians and Belarusian scenes occur in literature generated by Jewish authors; this is fully understandable, because many hundreds of thousands of Jewish immigrants to the United States came from Belarusian territories of the Pale.

One of the first to describe Belarus and Belarusians was Mary Antin. It is unfortunate that Antin and other Jewish writers use ethnic/geographical terminology that is inaccurate, describing Belarusian writings and individuals with the term "Russian," which compounded conceptual and terminological confu-

ЗЬМЕСТ
Table of CONTENTS

Thomas E. Bird. Editorial 3
James Dingley. The Poetry of Natalla Arsiennieva and 'Picrabudova' in Belarusian Literature 4
Deming Brown. The Art of Vasil' Bykau 15
Zinaida Gimpelevich-Schwartzman. Five Years after Chernobyl 24
Joanna Survilla. Chernobyl in Contemporary Belarusian Art 30
Robert J. Tamushanski. Belarusian-Yiddish Writings: Interesting Materials for Ethnography and Philology 36
Maria Paula Survillla. From Affirmation to Aesthetics: Belarus as Subject in Poetic in Poetic and Musical Texts 43
Jan Zaprudnik. Usievalad Ihnatouski — Belarusan Historian and Statesman 50
Thomas E. Bird. The Vitality amd Timeliness of *Nasa Niva* 59
УСПАМІНЫ — MEMOIRS
Лешчанка Язэп. «Казённы дом і казённая дарога» 65
ЗАЦЕМКІ — NOTES
Аляксандра Бэргман. Яшчэ раз пра Антона Луцкевіча 101
Vitaut Kipel. Notes on Belarusian-American-English Literary Relations 108
Алег Латышонак. Дакумэнты 118
КНІГАПІС — BOOK REVIEWS 121
АРХІВЫ — ARCHIVES
З архіваў БІНІМу 137
З архіваў БНР 147
В. Кіпель. Хроніка навуковага жыцьця 154
Паказьнік ЗАПІСАЎ — Index of ZAPISY 173